Источник: "Голас Радзімы" - 2014-02-06

# Вялікая і амаль забытая

## Падзеі Першай сусветнай вайны і быт насельніцтва ў той час на тэрыторыі Беларусі — у цэнтры ўвагі навуковых даследаванняў і новай кнігі

**Рыгор Арэшка**

Ні для кога не сакрэт: тысячы нашых супляменнікаў тая вайна адарвала ад родных мясцін, прымусіла блукаць па свеце ў пошуках прытулку, хлеба. І далёка не ўсе потым вярнуліся на Бацькаўшчыну. Былі ў эвакуацыі і бацькі народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. “Нарадзіўся Янка Брыль 4 жніўня 1917 года ў Адэсе ў сям'і рабочага-чыгуначніка, — чытаем, напрыклад, у яго біяграфіі. — У 1922 годзе бацькі яго вярнуліся на сваю радзіму, у вёску Загор'е Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці”. Пазней, дарэчы, ужо іншыя войны ламалі-выкручвалі лёс Івана Антонавіча Брыля: яму давялося служыць і ў польскай арміі, пабываць у палоне, партызаніць…

Нядаўна на прэзентацыі кнігі “Беларусь у гады Першай сусветнай вайны”, якая праходзіла ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі, гаварылася: вялікая вайна была нібы заслонена ў часе Вялікай Айчыннай і таму стала амаль забытай. Таму і выклікае вялікую цікавасць праца кандыдата гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Валянціны Бялявінай. У кнізе даследуюцца падзеі Першай сусветнай вайны, тагачасны побыт, жыццё людзей на тэрыторыі Беларусі. Пададзена шмат цікавых фотаздымкаў таго часу. Да імпрэзы ладзілася і выстава “Вялікая забытая вайна” з выданняў 1914—2013 гадоў: успаміны сучаснікаў і сведкаў вайны, дакументы, публікацыі ў розных выданнях, даследаванні навукоўцаў. Сярод іх — апавяданне Максіма Гарэцкага “На імперыялістычнай вайне”, што выйшла у 1926 годзе. Напісана яно, як вядома, на аснове дзённікавых запісаў і заметак, якія вёў пісьменнік у кароткіх перапынках паміж баямі.




Рыгор Арэшка. Вялікая і амаль забытая